ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕС

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 32 (1301) ПАНЯДЗЕЛАК, 9-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

11-га лютага пачынае сваю працу
1-я агульна-гарадзкая конфэрэнцыя рабочай моладзі Менску
з наступным парадкам дню:
1. Вынікі IX і X зьездаў ЛКСМ, 2. Вынікі выкананьня пляну ўдарнага кварталу і першага месяцу 3-га рашаючага году, 3. Садаклад аб становішчы і рацыяналізацыі плянава-опэрацыйных груп, 4. Пастанова журы аб пераходным сьцягу Гаркому ЛКСМБ і ВСНГБ.
Модус прадстаўніцтва 1 дэлегат ад 10 чалавек.
МЕНГАРКОМ ЛКСМБ

У АГНІ КЛЯСАВЫХ БОЕК

Краіны даляру і „цывілізацыі“ шалеюць у ціскох экономічнага крызісу

7 буйных фабрык Польшчы бастуюць

ВАРШАВА, 6. Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Згержы, якая праводзіцца ўжо два тыдні, зацягваецца. Бастуе каля 7 тыс. чал. Зусім спыніліся ўсе 7 буйных фабрык у Згержы. Кіраўніцтва забастоўкай у руках левай профсаюзнай арганізацыі. Забастоўка выбухла ў адказ на спробу прамыслоўцаў зьнізіць зарплату на 20 проц.

Голад і жабрацтва ў багатай Амэрыцы

НЬЮ-ЁРК.—У Паўднёвай частцы Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, якія летась былі ахоплены засухай, значная частка сельскагаспадарчага насельніцтва галадае. Сэнатар Караўэй заявіў, што ў паўднёвых штатах штодзённа памірае ад голаду 1.000 чалавек.

Апісваючы жабрацкае становішча насельніцтва ў штаце Кэнтуккі, корэспондэнт буржуазнай газэты „НЬЮ-ЁРК Івінінг Пост“ піша „Убоства дасягнула такіх памераў, што многія сем'і за бясцэнак распрадаюць свае пасьцелі і печкі. Людзі сьпяць на падлозе па сотні чалавек упокат. Некаторыя сем'і жывуць, як дзікія зьвеpы сярод скал, сьпяць на лісьцях і харчуюцца толькі карэньнямі“.

Шахтаўласьнікі пагражаюць закрыць шахты

ВЕНА, 8. Белграду паведамляюць, што прадпрыемствы буйнейшых вугальных шахт Юга-Славіі, зламалі ўчора колумовы. Шахтаўласьнікі пагражаюць закрыць частку шахт, калі 8 тысяч вуглякопаў ня згодзяцца на зьніжэньне зарплаты.

„АДНА ЗАПАЛКА І ВЫБУХНЕ СУСЬВЕТНЫ ПАЖАР“

ЛЁНДАН, 7.—Сёньня ў Лягоры (Індыя) адбыўся судовы процэс над Сікхам Талянам Сінгам, які забіў жонку ангельскага афіцэра.

На процэсе падсудны заявіў судзьдзі, што калі яго не павесяць і ён вызваліцца, дык ён зноў будзе забіваць ангельцаў. Сікх заявіў, што вялікая індыйская барацьба за вызваленьне, якая пачалася ў 1857 г. паўстаньнем у Кітаі, зараз выліваецца ў „падрыхтоўку вялікай рэволюцыі, якая ўжо пачалася па вёсках і даволі толькі аднае запалкі, каб выбух сусьветны пажар“.

Сікх прыгавораны да сьмерці.

Узмацняецца паўстанчая дзейнасьць

ЛЁНДАН, 7.—У паўночна-заходніх провінцыях Індыі зноў узмацнілася паўстанчая дзейнасьць афрыдыяў.

Паўстанцы напалі на ангельскую пяхоту ў нізіне Акахел, іх атака была настолькі моцнай, што на барацьбу з наступаючымі былі кінуты ўсе сілы артылерыі і самалёты англа-індыйскай арміі. Колькасьць забітых і раненых не ўстаноўлена.

ПЕРАМОГІ КІТАЙСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ШАНХАЙ, 7.—Газэта „Шэнь-Бао“ паведамляе, што комуністычныя атрады занялі горад Цзінь-Фы на поўначы провінцыі Хунань. У гэты раён пасланы некалькі батальёнаў нанкінскіх войск.

Пролетарская солідарнасьць у дзеяньні



Міжрабпом арганізаваў у ахопленых забастоўкай раёнах перасовачныя кухні.

НА ЗДЫМКУ: адна з перасовачных кухань Міжрабпому ў Рэмшэндзе.

„Нішто напісанае ў сьвеце аб СССР ня можа параўнацца з прамовай тав. Сталіна“

БЭРЛІН, 6.—Прамова тав. Сталіна на ўсесаюзнай конфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці зрабіла вялікае ўражаньне ў Нямеччыне. Усе газэты публікуюць падрабязныя вытрымкі з гэтай прамовы, пры чым асабліва падкрэсьліваюць словы тав. Сталіна аб магчымасьці выканаць пяцігодку ў рашаючых галінах за тры гады і аб неабходнасьці для СССР прарабіць за дзесяць год шлях у 50-100 год, на які Савецкі Саюз адстаў ад перадавых краін.

Комэнтуючы паведамленьне аб прамове тав. Сталіна, „Кельнішэ Цэйтунг“ піша: „Нішто сказанае і напісанае аб проблеме Савецкага Саюзу як унутры краіны, так і за межамі не ня можа параўнацца з прамовай тав. Сталіна па яе яснасьці, надзвычайнасьці і ўпэўненасьці. Гэта прамова дае квінт эсэнцыю політычнай і экономічнай гісторыі Расіі да сучаснага моманту і ўказвае шлях Расіі ў будучыню“.

„Кельнішэ Цэйтунг“ характарызуе тав. Сталіна як монумэнтальную гістарычную фігуру, і піша, што Сталін, гэты чалавек з жалезнай воляй, выводзіць Расію з убоства і адсталасьці і хоча вывесьці сьвет для лепшай будучыні“.

Газэта лічыць, што ніколі яшчэ Сталін не выяўляў сябе з такой яркасьцю, як у гэтай прамове на ўсесаюзнай конфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці.

Першая 5-дзёнка лютага не дала патрэбных вынікаў

Першая 5-дзёнка лютага, як і папярэднія 5-дзёнкі студзеня не зрабіла патрэбнага пералому на фронце загатовак ільна і пянькі. Спачатку кампаніі на 6 лютага плян загатовак ільна-валакна выкананы толькі на 27,3 проц., пянькі на 8,9 проц. ільнанасеньня—54,2 проц., каноплі—53,4 проц. За 5 дзён лютага процант загатовак валакна вырас толькі на 1,3 проц. і пянькі—на 0,9 проц.

Загатоўкі ільна-валакна ідуць нездавальняюча па ўсіх сэктарох, асабліва на гэты раз адстаюць колгасы, якія выканалі гадавы плян толькі на 20,1 проц.

Крыху лепш, але далёка нездавальняюча ідуць загатоўкі ў індывідуальным сэктары, які выканаў заданьні на 47,6 проц.

Па загатоўках ільнанасеньня плятуцца ў хвасьце індывідуальны сэктар—76,4 проц. выкананьня гадовага пляну. Перавыканалі гадавое заданьне па ільну-насеньні колгасы—108 проц.

Нездавальняюча ідуць загатоўкі пянькі і канапкі, як па індывідуальнаму сэктару, так і па колгасах.

Ня гледзячы на тое, што загатоўкі павінны скончыцца ў бліжэйшыя дні, мы маем такое становішча, што цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможніх гаспадарак у радзе раёнаў яшчэ не даведзены. Яскравым вузорам опортунізму на практыцы мы нагледаем у Сьмілавіцкім раёне, у якім па сёньнешні дзень пляны загатовак да кулацкіх двароў не даведзены, а значыцца ня выкананы.

Трэба падкрэсьліць, што шмат якія раённыя камітэты комсамолу (Сьмілавіцкі, Лядпянскі, Дубровенскі, Ветрынскі, а таксама і ячэйкі гэтых раёнаў) не пераключыліся тварам да ільназагатовак. Бязьдзейнасьць на гэтым фронце, нежаданьне дапамагчы загатоўцам у правядзеньні гэтай важнейшай політычнай кампаніі—зьяўляецца правым опортунізмам на практыцы.

Мы прапануем на працягу штурмавога двухдэкадніка арганізаваць усебеларускі суботнік комсамолу па дапамозе колгасам у апрацоўцы і здачы ільна-валакна.

Трэба кожнай комсамольскай ячэйцы арганізаваць ударныя брыгады з комсамольцаў, колгаснай, бядняцка-серадняцкай моладзі і дарослых для правядзеньня па вёсках масавай работы і арганізацыі чырвоных абозаў.

Групам „ЛК“ пад кіраўніцтвам органаў РСІ праверыць як выконваюцца дырэктывы ўраду аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў здачы льна і пянькі кулацка-заможнымі гаспадаркамі і выкананьне іх.

Праверыць дзейнасьць савецкіх, коопэрацыйных і загатоўчых організацый у правядзеньні загатовак.

Гэтыя мерапрыемствы, пры належным іх правядзеньні, забясьпечаць выкананьне к тэрміну заданьняў ільназагатовак.

Пяцьдзесят даляраў за голаў комуністага

(Ліст з Бэйпіна)

„Мне давялося быць сьведкай страшэнных малюнкаў крывавай расправы нанкінскіх генэралаў над студэнтамі ў провінцыі Сычуань.

Яшчэ з 10-га кастрычніка ў гор. Чэнду пачаліся дзікія забойствы, арышты, і рабункі студэнтаў. Разьюшаныя нанкінскія каты з крыкам:—„Зьнішчым распаўсюджвальнікаў комуністычнай заразы“ хапалі студэнтаў на вуліцах, ва ўстановах, у прыватных домах.

26-га кастрычніка у горадзе Гуанхане, што ў 20 кілёмэтрах ад Чэнду, адбылося паўстаньне 28-га корпусу нанкінскай арміі. Перапалохаўшыся, што комуністыя выкарыстаюць гэтае паўстаньне, нанкінскія генэралы пачалі яшчэ больш бязьлітасна распраўляцца з усімі комуністымі і западозранымі ў комунізьме.

Генэралы Дэн-Сі-хоў і Лю-Вен-хэй, задушыўшы паўстаньне, накінуліся на студэнства. У горадзе Чэнду яны адразу-ж расстралялі аднаго з дэканаў „Унівэрсытэту Заходняга Кітаю“ Ля-Бэн-луна западозрыўшы яго ў комунізьме. Па ўсіх школах і ўнівэрсытэтах провінцыі пракацілася хваля вобыскаў і арыштаў. Шмат студэнтаў былі расстраляны на месцы.

Чэнду наводнены цэлым патокам пераапранутых шпікаў. На ўсіх кутах ўстаноўлена ах..ая варта з аголенымі шаблямі. Забіваць сталі зусім адкрыта. Больш таго ўлада абяцала 50 сярэбраных даляраў за кожную галаву комуністага. Па няпоўных вестках, за некалькі дзён было забіта больш за 300 студэнтаў. Многія школы і кнігарні зачыніліся. Мясцовыя газэты імкнуліся прасіць літасьці генэралаў весьці „больш умераную“ політыку. У адказ на гэта ім проста забаранілі агалашаць весткі аб арыштах і забойствах.

Дзесятага лістапада ўласьці заявілі, што яны прыпыняюць прасьледваньне камуністых. А праз чатыры дні ў Гуаньдунськім унівэрсытэце зноў пачаліся вобыскі і арышты. 200 салдат рабавалі унівэрсытэт. вытрахваючы з студэнцкага інтэрнату ўсё, аж да бялізны. У гэты-ж дзень паўтарыліся арышты студэнтаў у „Коледжы Мастацтваў“ і Інжынэрным. У наступную раніцу ў настаўніцкім унівэрсытэце адразу расстралялі дзесяць чалавек.

Я памятаю жудасны выпадак расправы над дзяўчынай—студэнткай „Сычуаньскага Інстытуту Мастацтваў“. Я пачуў дзікія нечалавечыя крыкі і кінуўся да брамы і стытуту, але мяне адпіхнуў натоўп звар'яцелых салдат, якія прывязвалі студэнтку нагамі да брамы. Валасы зашавяліліся, калі расчыніўшы браму, салдаты разарвалі дзяўчыну папалам.

У гэты-ж дзень салдаты расстралялі ў „Чайным Коледжы“ двох студэнтаў, а потым выцяглі з гарнізоннага штабу яшчэ двох арыштаваных. Першага прыстрэлілі, а другога, якому яшчэ ня было 20 год, таксама разарвалі папалам. Забойства студэнтаў бяз суда і следзтва адбываецца штодня. З сярэдзіны сьнежня 200 салдат абкружылі „Коледж Пчалаводства“ і, выстраіўшы на двары ўсіх студэнтаў старанна абыскалі іх, накіраваўшы ў грудзі дулы вінтовак. Двое „падазроных“ былі прыстрэлены на месцы. Праз некалькі дзён ў коледжы зноў паўтарыўся вобыск і яшчэ двое былі расстраляны.

З паловы лістапада ў горад пачалі сьцякацца родныя забітых вучняў, Імі былі перапоўнены ўсе гасьцініцы гораду. Жудасны малюнак ўяўляў пляц перад домам штабу гарнізону, на якім некалькі сот родных апазналі трупы сваіх блізкіх.

Організавана „Ліга родных каханых вучняў“, якая абяцала змагацца з забойцамі, пакуль іх блізкія ня будуць адпомшчаны.

Уласьці сьпешна прыймаюць захады супроць гэтай „Лігі“. Па горадзе аддадзены загад, які абавязвае кожную сям'ю даць паруку ад 10 іншых сем'яў. Сурова забаронена жыхарам гораду даваць начлег без дазволу ваеннай улады. Увесь гарнізон і поліцыя мобілізаваны. Профсаюзы распушчаны. Сходы забаронены.

Гэта крывавая „кампанія супроць камуністых“ выклікала хвалю абурэньня і протэсту па ўсім Кітаі. Нанкінскі ўрад, баючыся сур'ёзных вынікаў, перамясьціў і звольніў некаторых з генэралаў, каб паказаць, што ўрад прымае такія-сякія захады. Але прыгнечаныя працоўныя масы Кітаю ведаюць цану гэтым перамяшчэньням. У адказ на разгул крывага тэрору, рэволюцыйныя рабочыя і сяляне уздымаюць вышэй сьцяг барацьбы супроць нанкінскіх катаў. Растуць і мацнеюць шэрагі Чырвонай арміі, якая геройчна змагаецца за ўладу саветаў.

Хунь-цзы-шань.

ДАЦЬ ПА РУКАХ ОПОРТУНІСТЫМ

Караваеўская ячэйка нават не абгаварвала пытаньня ільназагатовак

РУДЗЕНСК, 8 (Па тэлеф. ад нашага спэцкора). Ільназагатоўкі у Рудзенскім сельсавеце праходзяць нездавальняюча. Плян загатовак ільнавалакна і ільнасеньня выкананы толькі на 12,5 проц.

Кулацка-заможныя гаспадаркі—іх па сельсавеце 15-ця выконваюць даведзеных да двара заданьняў.

Колгасы „Сав. Беларусь“, „Безбожнік“ і „Вясёлае Жыцьцё“ ніводнага кілё ільну дзяржаве не здалі.

Рудзенская і Караваеўская яч. ЛКСМБ у ільназагатоўках не бяруць удзелу. Караваеўская ячэйка ні разу не абгаварвала нават пытаньня аб ільназагатоўках.

Такая махровейшая опортуністычная практыка да гэтага дню не сустракае ніякага рэагаваньня з боку кіраўніцтва партыйнай і комсамольскай організацый раёну.

Патрэбны тэрміновыя, рашучыя меры для таго, каб пляны ільнозагатовак былі выкананы. Патрэбна рашуча даць па руках тых, якія ігнаруюць дырэктывы партыі і ўраду па ільназагатоўках.

Г. Фрыд

ПАКОНЧЫЦЬ З АГУЛЬНЫМІ РАЗВАЖАНЬНЯМІ

Упрэгчыся ў барацьбу за лес. Квартальнае заданьне павінна быць выканана

КІНУЦЬ УСЕ СІЛЫ КОМСАМОЛУ НА ЛЕСАЗАГАТОЎКІ

Трэцяя дэкада студзеня ня прынесла ніякіх зрухаў на фронце лесазагатовак.

Загатоўка і вывазка лесаматар'ялаў і дроў, з-за опортуністычнай практыкі многіх леспрамгасаў і іншых раённых арганізацый,—у катастрофічным стане.

Толькі бязьдзейнасьцю і нежаданьнем мобілізаваць шырокія колы колгасьнікаў і бедняцка-серадняцкіх мас на барацьбу за лес можна вытлумачыць такое становішча.

Трэба констатаваць, што шэраг леспрамгасаў у студзені месяцы ня толькі ня выканалі квартальнага заданьня, але і блізка не надыйшлі да гэтага. Да такіх леспрамгасаў адносяцца: Тураўскі, які загатовіў толькі 16,3 проц. квартальнага пляну Уборацкі—17,8 проц., Друцкі—12,9 проц., Бярэзінскі—10,6%, Глускі—17,1 проц., Быхаўскі—16,1 проц.

Да леспрамгасаў, якія сапраўды здолелі мобілізаваць масы працоўнага сялянства на лесазагатоўкі і, за студзень месяц ня толькі забясьпечылі выкананьне пляну за квартал, але нават і перавыканалі квартальныя заданьні, альбо набліжаюцца да выкананьня, адносяцца: Нёманскі, які выканаў квартальнае заданьне за студзень на 214 проц., Віцебскі—на 143 проц., Гомельскі—на 80 проц., Аршанскі—на 75,6 проц., Чэчэрскі—на 63,5 проц., Бешанковіцкі—на 61 проц.

Загатоўка дроў ідзе яшчэ горш, чым загатоўка будматар'ялаў. Квартальнае заданьне выканана толькі на 10,3 проц.

Такія мізэрныя тэмпы загатовак ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьня адказнага і разам з гэтым рэальнага заданьня ўраду і партыі.

Толькі адзін Плешчанскі вучлеспрамгас загатовіў 34,8 проц. квартальнага заданьня, астатнія 34 леспрамгасы ганебна праваліваюць загатоўку дроў.

Асабліва дрэнна ідуць загатоўкі ў тых-жа самых Тураўскім Вучлеспрамгасе—2,4 проц, Уборацкім—3 проц, Бярэзінскім—2,6 проц, Глускім—2,8 Асіпавіцкім—4 проц, і Бабруйскім—5,9 проц.

Вывазка яшчэ пад пагрозай.

Ня гледзячы на тое, што за трэцьцюю дэкаду студзеня, у параўнаньні з другою, вывазка будматар'ялаў павялічылася на 250 проц, а дроў на 195 проц, усё-ж гэтыя тэмпы застаюцца нездавальняючымі. Пляны вывазкі будматар'ялаў выкананы толькі на 12,2 проц. а дроў—на 14,5 проц.

Гэта катастрофічныя паказчыкі. Яны гавораць аб тым, што ў лютым—рашаючым месяцы лесазагатовак—тэмпы па вывазцы лесу павінны быць падвесапкроены. Трэба скарыстаць санную дарогу, каб поўнасьцю забясьпечыць выкананьне лесасплаву. Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па кулаку, які імкнецца сарваць лесазагатоўкі.

Ні на хвіліну нельга забыцца аб тым, што невыкананьне пляну лесазагатовак—удар па нашай валюце, на будуючыхся прамысловых волатах, а адгэтуль—па ўмацаваньні абароназдольнасьці нашай краіны.

Падхопім каштоўную ініцыятыву паасобных комсамольскіх ячэек арганізаваць варашылаўскія чырвоныя абозы па вывазцы лесаматар'ялу.

У адказ на паклёпы ангельскіх цьвёрдалобых аб тым, што быццам на лесазагатоўках у Савецкім Саюзе ўжываецца праца зьняволеных, адкажам дзесяткамі і сотнямі масавых чырвоных абозаў і суботнікаў на лесазагатоўках.

13-ю гадавіну Чырвонай арміі сустрэнем дзесяткамі і сотнямі ўдарных брыгад імя Чырвонай арміі і яе лепшага чырвонага палкаводца-Варашылава.

Ніводнага бярвяна не пакінуць ня вырубленым ні невывезеным да крыжакі і да чыгункі—вось баявая задача кожнага леспрамгасу, кожнай комсамольскай ячэйкі ў лесе.

Сэкратарскае багаслаўленьне

„Яны ўсё роўна ня пойдуць на лесазагатоўкі"

Асіповіцкі Леспрамгас квартальнае заданьне па загатоўцы лесу ў студзені месяцы выканаў: дроў—на 4,5 проц., дзелавой драўніны—37 проц., па вывазцы: дроў—14 проц. заданьня і дзелавой драўніне—11 проц. Зусім сарвана выкананьне пляну загатоўкі фанэрнай альхі. Квартальнае заданьне—40 проц. кубамэтраў у студзені выканана толькі на 2,3 проц.

Што-ж робяць партыйныя і комсамольскія арганізацыі раёну?

Партыйная арганізацыя лесазагатоўкамі ня кіруе. Комсамол у поўнай меры бязьдзейнічае. Усе раней мобілізаваныя комсамольцы дэзэртавалі з лесазагатовак. Райком камсамолу ня прыняў да іх ніякіх мер. Сакрататар райкомолу Якубовіч зусім не знаёмы з становішчам лесазагатовак і з ўдзелам у іх комсамолу. Ён толькі гаворыць: „я мобілізаваў 12 комсамольцаў на лесазатоўкі". Але падумаць аб тым, як практычна ўзьняць гэту работу,—ня хоча.

Калі-ж яму прапанавалі ў другі раз мобілізаваць комсамольцаў на лесазагатоўкі, ён адмовіўся: „нічога ня будзе, яны ўсё роўна ня пойдуць".

Права-опортуністычныя надзеі на самацёк з боку кіраўніцтва комсамольскай арганізацыі прывялі к таму, што ні адна комсамольская ячэйка ня ўдзельнічае ў выкананьні пляну лесазагатовак. Абвешчаны ўдарны месячнік ліквідацыі прарываў не ўзварушыў комсамольскіх арганізацый.

Трэба рашуча ўдарыць па права-опортуністычнай практыцы Асіповіцкага райкому комсамолу, выгнаць з комсамолу тых хто дэзэртаваў з адказнейшага гаспадарчага фронту. У 3-ю дэкаду лютага—дабіцца карэннага пералому ў лесазагатоўках, поўнасьцю выканаць заданьне.

Т. Цалко

Абвясьцілі сябе ўдарнікамі

Бязувенская комсамольская ячэйка ў ліку 7 чалавек абвясьціла сябе ўдарнай па ліквідацыі прарываў у лесазагатоўках. Комсамольцы будуць працаваць на лесазагатоўках на працягу ўсяго ўдарнага месячніку.

Г. і і.

На лесазагатоўках

Барысаўскі леспрамгас ня выконвае квартальнага заданьня

БАРЫСАЎ, 8. (Па тэлефону ад нашага юнкора).

Плян лесазагатовак у Барысаўскім леспрамгасе зрываецца. Квартальныя заданьні па будматар'ялах на 1-е лютага выкананы на 26,5 пр. па дровах—на 10,4 проц. Яшчэ горш з вывазкай. Будматар'ялаў вывезена 10,6 проц., дроў—4,8 пляну. Абвешчаны месячнік лесазагатовак ніякіх зрухаў на леспрамгасу ня даў, наадварот—тэмпы зьнізіліся.

Леспрамгасу патрэбны для вывазкі 4024 падводы, а працуюць толькі 2300.

У сучасны момант Леспрамгас выконвае экспортны плян, а таму шэраг фабрык і заводаў Барысава застаюцца без дроў і будматар'ялаў. Іншыя фабрыкі („Профінтэрн") напярэдадні астаноўкі.

Кугель

Прымусіць кулака выканаць плян

СЬМІЛАВІЧЫ 7. (Ад нашага юнкора). Па раёне трэба загатовіць 33.300 кубамэтраў будаўнічай драўніны і 12960 кубамэтраў дроў. Загатоўлена: 18,000 к-м будаўнічай драўніны альбо—54 проц. заданьня, дроў 2890 к-м.—22,9%. Вывезена будаўнічай драўніны 1300 к-м,—3,89 проц. пляну, задана было 30.000 к-м дроў 210 к-м.—3,5 проц. заданьня.

На загатоўках не хапае інструмантаў і кваліфікаванае сілы. Продукцыйнасьць працы нізкая, тэхніка вывазкі дрэнная. З 40 колгасаў раёну ў лесазагатоўках прымае ўдзел толькі адзін. Кулацкія гаспадаркі ня выконваюць даведзеных да іх плянаў, сельсаветы ня ўжываюць ніякіх мер.

Ф.

Горацкі комсамол праваліў мобілізацыю

Горацкі райком комсамолу вынес пастанову аб мобілізацыі 200 комсамольцаў на лесазагатоўкі. Аднак, дзякуючы бязьдзейнасьці Райкому, мобілізацыя сарвана. Замест 200 комсамольцаў зьявілася толькі—4, якія праз дзень уцяклі з лесазагатовак.

Прыбытак

ВЫКАРЫСТАЦЬ ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ, ПАДЦЯГНУЦЬ АДСТАЮЧЫХ

Выраўняць фронт да другой бальшавіцкай

Кожнай ячэйцы—конкрэтнае заданьне

25—І пленум Капаткевіцкай арганізацыі, сумесна з комсамольцамі—членамі сельсаветаў, праўленьняў колгасаў і піонэр працоўнікамі—распрацоўваў пытаньне аб падрыхтоўцы да правядзеньня перавыбараў праўленьняў колгасаў і другой бальшавіцкай вясны.

Пасеўныя пляны ўжо даведзены да кожнае вёскі, саўгасу, колгасу і зьўляюцца цалкам рэальнымі. Але для выкананьня іх трэба будзе правесьці значную працу, напружыць усе сілы. Пленум ухваліў у вясеньнюю пасеўкампанію дабіцца 35проц. колектывізацыі сельскай гаспадаркі (цяпер 10,9 проц.) і пасеўнай плошчы 45проц. Кожнай комсамольскай ячэйцы дана конкрэтнае заданьне па ўдзелу ў правядзеньні вясновай кампаніі. Ячэйкі ўжо прыступілі да выкананьня заданьняў. Пленум ухваліў у час вясновай сяўбы ахапіць колгасамі астатнія 24 проц. комсамольцаў індывідуальнікаў.

Перавыбары праўленьняў колгасаў будуць выкарыстаны для таго, каб умацніць іх рост. На працу старшынь колгасаў намячаюцца 4 лепшыя комсамольцы.

Пост „Ч. З."—Гай

ПАРА ПРАЧНУЦЦА

Ужо некалькі месяцаў організацыя ЛКСМБ узмоцненым тэмпам рыхтуецца да вясеньняй пасеўнай кампаніі. Аднак, узьнятая ініцыятыва некаторых ячэек, на аснове рашэньняў партыі, не падхоплена комсамольскай ячэйкаю „Майскі Луч" (Чырвона Слабодскі раён). Ва ўсіх кампаніях і мерапрыемствах ячэйка ня ўдзельнічае.

Ня гледзячы на дырэктывы РК ЛКСМБ правесьці сходы колгаснай моладзі—ячэйка гэтага не зрабіла, бо кіраўніцтва ячэйкі, у выніку опортуністычнай практыкі, аказалася няздольным стаць на чале ўздыму колгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі.

Ячэйка нават не абгаварыла конкрэтных мерапрыемстваў для правядзеньня вясновай пасеўкампаніі.

Рашэньні IX і X зьездаў комсамолу ў ячэйцы не распрацоўваюцца, аб іх ня ведаюць комсамольцы.

Неабходна тэрмінова правесьці агляд гэтай ячэйкі, якая апынулася ў права-опортуністычным балоце і зьмяніць яе кіраўніцтва, як няздольнае ажыцьцяўляць рашэньняў партыі і саюзу.

А—сь

Сталёвы конь павінен быць здаровым

ОРГАНІЗАВАЛІ КОЛГАС

Комсамольская брыгада Грэскай ячэйкі комсамолу ў вёсцы Старына, Грэскага сельсавету організавала колгас. У колгас уступіла 9 гаспадарак, якія ўжо абагулілі насеньне і с.-г. інвэнтар. Комсамольская ячэйка актыўна дапамагае колгасу рыхтавацца да вясновай сяўбы. Ячэйка, разам з колгасьнікамі, праводзіць масава-выхаваўчую працу сярод аднаасобнікаў.

Юнкор Макарэнка.

Інвэнтар не рамантуюць

Колгас Сталіна, Заслаўскага раёну, яшчэ не распачаў падрыхтоўчай працы да вясновай пасеўкампаніі. Машыны і сельска-гаспадарчы інвэнтар не рамантуюцца. Комсамольская ячэйка ў гэтым колгасе бязьдзейнічае.

Я. Шацкі.

Ячэйка ня ўдзельнічае ў гаспадарчым жыцьці колгасу

На справаздачным сходзе праўленьня колгасу „Перамога" (Сьмілавіцкі раён) абгаварвалася праца праўленьня колгасу за год, пытаньні далейшай працы колгасу, падрыхтоўкі да вясновай сяўбы, і інш. гаспадарчыя пытаньні, але комсамольцы ніякага ўдзелу ня прынялі Большасьці комсамольцаў ня было на сходзе. Колгасьнікі ў сваіх выступленьнях адзначалі, што комсамольцы колгасу ня выконваюць сваіх абавязкаў і горш працуюць чым беспартыйныя

У ячэйцы ёсьць комсамольцы кар'ерыстыя, якія ўсюды хвастаюцца сваім комсамольскім білетам. Сэкратар ячэйкі адносіцца да працы абыякава.

Савіч

Дапамагчы ячэйцы ўзьняць працу

Комсамольская ячэйка колгасу „Чырвоны Маяк" (Случчына) мела нядаўна значныя посьпехі, актыўна ўдзельнічаючы ў колгасным будаўніцтве і вясеньняй пасеўкампаніі 1930 году, але за апошні час яна паслабіла сваю працу.

Сэкратар ячэйкі Пунчык Васіль нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў. Сходы ячэйкі не праводзяцца. Да перавыбарчай кампаніі праўленьня колгасу ячэйка нічога не зрабіла. Сярод насельніцтва зусім не папулярызавана значэньне перавыбараў.

У падрыхтоўцы да вясеньняга севу ячэйка ўдзелу ня прымае. Выхаваўчая праца ў ячэйцы і палітвучоба не праводзіцца Сэкратар ячэйкі Пунчык замест праводзіць палітзаняткі ходзіць на вячоркі. Вайсковы гурток не працуе. Трэба дапамагчы ячэйцы выправіць недахопы.

Мятля

Напярэдадні III усебеларускага настаўніцкага зьезду

ШКОЛА ПАВІННА СТАЦЬ ПОЛІТЭХНІЧНАЙ

СТАРАЯ СЛАВЕСНАЯ ШКОЛА ПАВІННА БЫЦЬ РЭОРГАНІЗАВАНА Ў САПРАЎДНУЮ ПОЛІТЭХНІЧНУЮ ШКОЛУ—КУЗЬНЮ КАДРАЎ ДЛЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ

ДА ТРЭЦЯГА УСЕБЕЛАРУСКАГА

У надзвычайна адказны гістарычны пэрыод, у пачатку рашаючага 3-га году пяцігодкі, склікаецца 3-ці Усебеларускі настаўніцкі зьезд. Ён склікаецца ў той час, калі пролетарыят Савецкага Саюзу з нябачаным энтузіязмам ажыцьцяўляе складаныя і адказьнейшыя задачы па завяршэньню фундаманту соцыялістычнай эканомікі, у час абвостранай класавай барацьбы і пасіленьня небясьпекі нападу імпэрыялістых на СССР.

З часу другога зьезду прайшло тры гады. Гэтыя гады былі гадамі велізарных посьпехаў у справе соцыялістычнага будаўніцтва СССР, яны былі гадамі пералому і для мас настаўніцтва, бо значна ўзрос колькасна і палепшыўся якасна соцыяльны склад настаўніцтва. Значна ўзрасла партыйная і комсамольская праслойка. Павялічыўся працэнт настаўнікаў, выхадцаў з пролетарскага батрацка-бядняцкага асяродзьдзя.

Партыя і ўрад паставілі настаўніцтва на надзвычайна адказны ўчастак работы па комуністычнаму выхаваньню маладога пакаленьня. Менавіта тут, на гэтым участку патрабуецца праводзеньне выразнай класавай лініі. Мы ведаем да чаго імкнулася контррэволюцыйныя беларускія нацдэмы па лініі культурнага будаўніцтва. Яны змагаліся з дыктатурай пролетарыяту, з партыяй за педагогічныя кадры, яны хацелі перавыхаваць настаўніцтва ў пажаданым ім кірунку. Зьезд павінен будзе падвесьці вынікі становішча работы сярод настаўніцтва і вызначыць далейшыя мерапрыемствы па палепшаньню гэтай работы. На зьезьдзе павінны быць абгавораны і вырашаны пытаньні лепшай політычнай і вытворчай падрыхтоўкі настаўніцтва.

Часу засталася мала. Партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя і савецкія органы павінны, ня губляючы ніводнае хвіліны, прыступіць да падрыхтоўчае працы.

С. Рычкоў

Працуюць па-старынцы

Політэхнізацыя школ па Сьмілавіцкім раёне зрываецца. Райінспэктар Гусін мала цікавіцца гэтым пытаньнем і ня даў конкрэтных указаньняў школам па пытаньню політэхнізацыі.

Як 7-годовыя так 4-годовыя школы да гэтага часу ня маюць яшчэ майстэрняў і не прымацаваны да прадпрыемстваў. Заняткі ў школах праводзяцца старымі мэтодамі.

Раённы камітэт партыі і комсамолу павінны заняцца справай політэхнізацыі школ і безадкладна прымацаваць іх да прадпрыемстваў.

А. Зоркі

А калоды гніюць

У Капцэвічах, пры заводзе „Зорка", ёсьць школа ФЗВ. У школе вучыцца 210 чалавек, а памяшканьне прыстасавана толькі на 150 чалавек.

Вучням цэлы дзень прыходзіцца стаяць, бо няма дзе сесьці. Летась навазілі калод, але яны не скарыстаны і гніюць.

РВК увесь час толькі абяцае пабудаваць школу.

Пастанову НКА аб пабудове ФЗС у Капцэвічах РВК ня выконвае. Адпаведным органам трэба прыняць конкрэтныя захады, каб палепшыць становішча школы.

А. Бураленка

ДАГАВОР

паміж ЦК ЛКСМБ, НКА, ЦСПСБ, ВСНГБ, НКЗ, Колгасцэнтрам аб сумесным будаўніцтве політэхнічнай школы

15 лютага распачынае сваю працу III Усебеларускі настаўніцкі зьезд.

Зьезд павінен будзе падвесьці вынікі нашай барацьбы за ўсеабуч і політэхнічную школу, вызначыць далейшыя шляхі ў прыватнасьці па політэхнізацыі школы больш глыбокай увязкі яе працы з вытворчасьцю.

Асноўная форма падрыхтоўкі кадраў—ФЗВ і ШКМ павінна быць забясьпечана адпавядаючымі запатрабаваньням сучаснасьці настаўнікамі.

Сёньня мы зьмяшчаем дагавор, заключаны паміж ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, ВСНГБ, НКА, НКЗ і Колгасцэнтрам па політэхнізацыі школ. ВСНГБ у адносінах да політэхнізацыі школ імкнецца пайсьці па шляху найменшага супраціўленьня, ня высоўваючы пункты конкрэтнай барацьбы за політэхнічную школу.

Дагавор высоўвае мінімальныя ўмовы, якія патрабуюцца ад організацый для стварэньня нармальных умоў па політэхнізацыі школы. Наша задача—змагацца за максымум, 100-проц. ажыцьцяўленьня пастаноў політэхнічнага зьезду.

Комсамольскія організацыі павінны зараз-жа разгарнуць сваю работу ў напрамку рэалізацыі дагавору, дамагаючыся выкананьня ўсіх абавязкаў, узятых зацікаўленымі організацыямі.

Нашай народнай гаспадарцы патрэбны кадры актыўных удзельнікаў вытворчага процэсу, актыўных творцаў, ініцыятараў і рухавікоў соц. рэконструкцыі.

Наша школа пры сучасным становішчы, будучы адарванай ад працы і вытворчасьці, будучы пераважна школай славесна-начотніцкай, ні ў якім разе ня можа падрыхтоўваць такія кадры моладзі.

Мы павінны тэрмінова перабудаваць нашу школу ў політэхнічную, у ФЗС у рабочых раёнах і ШКМ у сельскіх мясцовасьцях.

ЦК ЛКСМБ, НКА, ЦСПСБ, ВСНГ, НКЗ і Колгасцэнтр бяруць на сябе абавязкі сумеснымі сіламі і сродкамі тэрмінова прыступіць да будаўніцтва і організацыі у БССР політэхнічнае школы.

Наркомасьветы абавязваецца:

* Безадкладна пачаць рэорганізацыю ўсіх 7-мі годак у горадзе ў ФЗС і школы камунальнае 7-мі годкі, а 7-мі годкі на вёсцы—у ШКМ, з тым, каб скончыць яе да канца гэтага навучальнага году.

* Ахапіць у 31 навучальным годзе 100 проц. дзяцей членаў профсаюзаў ў горадзе, усю батрацкую моладзь на вёсцы і ня менш 50 проц. дзяцей колгасьнікаў, а у комунах—100 проц. дзяцей комунараў школамі ФЗС і ШКМ.

* Да 1-га лістапада 31 г. прапрацаваць і забясьпечыць ФЗС і ШКМ новымі праграмамі і навучальнымі плянамі.

* Забясьпечыць ФЗС і ШКМ неабходным педагогічным складам, прыдаць вытворчы ўхіл тэхнікумам і організаваць вытворчую практыку студэнтаў. Ахапіць асноўныя масы настаўнікаў ФЗС і ШКМ у 30-31 г. перападрыхтоўкай па пытаньнях політэхнізацыі школы.

* Забясьпечыць у 1931 навучальным годзе да 15-га жніўня школы ФЗС і ШКМ падручнікамі, праграмамі, навучальнымі плянамі, вучпрыладамі, кадрамі настаўнікаў і г. д. (для чаго своечасова скласьці плян забясьпечаньня школ).

* Своечасова забясьпечыць школы і біб-кі літаратурай па політэхнізацыі школ.

* Забясьпечыць школы ў 30-31 навучальным годзе не пазьней 15-га жніўня памяшканьнямі. (рамонт, пабудова, абсталяваньне).

* Праз Белдзяржвыдавецтва забясьпечыць своечасовае выданьне літаратуры і падручнікаў па пытаньнях політэхнічнай асьветы.

* З мэтай перадаць вопыт організацыі ФЗС і аказаць дапамогу ШКМ у перабудове сваёй працы для лепшага выкананьня задач соц. будаўніцтва—устанавіць шэфства ФЗВ над ШКМ.

Комсамол бярэ на сябе наступныя абавязацельствы:

* Прыцягнуць увагу шырокай масы комсамольскай рабочай і колгаснай моладзі і ўсіх працоўных да будаўніцтва політэхнічнае школы.

* Падрыхтаваць і высунуць у якасьці загадчыкаў, інспэктароў працы ў школах ФЗС і ШКМ у 30-31 г. ня менш 100 чалавек рабочай і колгаснай моладзі. Мобілізаваць у педагогічныя навучальныя ўстановы 100 чалавек комсамольцаў і перакінуць на сталую працу ў школе 50 ч. піонэрпрацаўнікоў.

* Дабіцца 100 проц. ахопу піонэрорганізацыяй дзяцей рабочых, батракоў, колгасьнікаў, якія навучаюцца ў ФЗС і ШКМ.

* Організаваць масавы ўсебеларускі суботнік па БССР у дапамогу політэхнічнай школе, а таксама масавы паход за абсталяваньне школы.

* Штомесячна камітэтам РК ЛКСМБ організоўваць налёты груп „ЛК" на школы, органы асьветы і прадпрыемствы з мэтай выяўленьня становішча політэхнізацыі школы; заслухоўваць на РК даклады і інформацыі аб ходзе політэхнізацыі, уключыўшы гэтыя пытаньні ў пляны працы РК.

ЦСПСБ лічыць сябе абавязаным:

* Падабраць на працягу 1930-31 г 100 чал. кваліфікаваных рабочых для працы ў ФЗС у якасьці загадчыкаў і інструктароў працы.

* Прымацаваць праз МБІД да кожнай ФЗС па аднаму інжынэру, альбо тэхніку для масавой работы сярод вучняў, бацькоў, настаўнікаў па вытворча-тэхнічнай прапагандзе.

* Абавязаць фабзаўкомы і месцкомы ўключыць у свой опэрацыйны плян пытаньні работы ФЗС, і ня менш разу на квартал заслухоўваць на сваіх пасяджэньнях і агульных сходах рабочых пытаньні аб працы ФЗС

Узьдзейнічаць на гаспадарчыя організацыі і правяраць іх работу па перабудове і рэорганізацыі школы.

* Скласьці на прадпрыемствах брыгады з рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу па праводжаньню політэхнізацыі школы.

* Мобілізаваць 300 рабочых з прадпрыемстваў у педвузы.

* Поўнасьцю забясьпечыць біб-кі і рабочыя клюбы літаратурай па політэхнічнай асьвеце для популярызацыі гэтага пытаньня сярод рабочых.

ВСНГБ абавязваецца:

* Пры ўсіх новых прадпрыемствах, якія пачнуць будавацца ў 1931 г., разам з пабудовай пры іх школ ФЗВ, уключыць і будаўніцтва майстэрняў для ФЗС, забясьпечыўшым іх неабходным абсталяваньнем.

* Разам з НКасьветы і профсаюзамі правесьці да 1-га студзеня 1931 г. фактычнае прымацаваньне ФЗС да прадпрыемстваў.

* Выдзеліць усе магчымыя з нескарыстаных рэзэрвных фондаў прадпрыемстваў варштаты, інструманты, інвэнтар для абсталяваньня ў ФЗС майстэрняў, аказваць поўную дапамогу комсамолу ў праводзеньні суботніку па збору абсталяваньня, інвэнтара, лому сыравіны і ўзораў, прыгодных для ФЗС.

* Даць магчымасьць організоўваць на прадпрыемствах політэхнічную перападрыхтоўку настаўнікаў і кіраўнікоў ФЗС скарыстаўшы для гэтага цэхі, лябораторыі і майстэрні.

* Там, дзе дазваляе памяшканьне прадпрыемства, організаваць у 31 г. вытворчыя цэхі для практычнай працы вучняў ФЗС, па асобнаму сьпісу, узгодненаму з адпаведнымі органамі.

* На працягу першай паловы 1931 г. распрацаваць пытаньне аб організацыі выбару прасьцейшага абсталяваньня школамі ФЗС.

* Прыняць удзел у працы профсаюзаў, ІТС і КСМ з тым, каб прыцягнуць да работы па складаньню і абгаварэньню праграм ФЗС спэцыялістых, кваліфікаваных рабочых і моладзь з прадпрыемстваў.

* Усю работу па разгортваньню і організацыі політэхнічнай асьветы уключыць, як адну з асноўных галін работы аддзелаў кадраў у пляны працы, ВСНГ БССР, яго аб'яднаньняў і нам. дырэктароў па працы прадпрыемстваў.

Абавязацельствы НКЗ і колгасцэнтру

* Прыняць актыўны ўдзел у рэорганізацыі і наданьні ШКМ вытворчых ухілаў. Прымацаваць ШКМ да колгасаў і саўгасаў БССР, зрабіўшы іх вучэбным цэхам колгасу і саўгасу

* Дапамагчы абсталяваць ШКМ адпаведнымі габінэтамі, майстэрнямі і лябораторыямі, абавязаўшы колгасы і саўгасы аказваць ім у гэтым матэр'яльную дапамогу

* Забясьпечыць школы зямельнымі ўчасткамі для вопытна-паказальнай работы. Выдзеліць неабходную колькасьць жывёлы для вопытна-паказальнага харчаваньня. Прадставіць школам магчымасьць выводзіць парніковыя культуры для навучальна-практычных заняткаў. Прадстаўляць школам колгасныя і саўгасныя с-гасп. машыны, трактары, цяглавую сілу і г. д.

* Прадставіць у распараджэньне школы, для скарыстаньня і організацыі працоўных заняткаў вучняў, колгасныя і саўгасныя майстэрні і інш. вытворчыя колгасныя прадпрыемствы.

* Абавязаць колгасы і саўгасы прыняць удзел у будаўніцтве ШКМ, у матэр'яльным забясьпечаньні вучняў беднякоў, батракоў, і колгасьнікаў як у натуральнай, так і у грашовай форме, выдучыўшы для гэтага адпаведныя сродкі з фонду, які ствараецца ў кожным колгасе з 10 проц. адлічэньняў ад культфонду, прызначанага для патрэб усеагульнага навучаньня, згодна пастановы праўленьня Белколгасцэнтру ад 16-Х-30 г.

* Прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў рабоце ШКМ колгасных і саўгасных спэцыялістых (агрономаў, трактарыстых, жывёлаводаў і г. д.) для чытаньня лекцый, кіраўніцтва вытворчай практыкай і выкладаньня агро-дысцыпліны у ШКМ.

* Організаваць у кожным саўгасе і колгасе фонд вучобы для ШКМ, засеяўшы дзеля гэтай мэты ня менш 3-х га, у залежнасьці ад велічыні саўгасу і патрэбы ў фондзе.

* Забясьпечыць магчымасьць навучальна-вытворчай практыкі для вучняў на палёх і ў прадпрыемствах колгасаў і саўгасаў.

* Пры выкананьні гэтага дагавору ўсе організацыі, якія пад ім падпісаліся, абавязваюцца каардынаваць сваю работу на грунце адзінага пляну. Да праверкі дагавору прыцягваюцца рабочыя брыгады, атрады „ЛК", скарыстоўваюцца ўсе формы грамадзкага кантролю і праверкі.

Нарком. асьветы БССР **Платун**
Сэкратар ЦК ЛКСМБ **Гуткін**
За старшыню ЦСПСБ **Клімковіч**
Нам. старшыні ВСНГБ: **Страхоўскі**
Нарком. земляробства **Паніматкв**
Старшыня колгасцэнтру **Міцькоў**

У тэхнікуме сувязі небясьпечна

Вучоба ў Менскім тэхнікуме сувязі праводзіцца старымі мэтодамі. Умову па соц. спаборніцтву эксплёатацыйнага тэхнікуму з транспортным профкомам паклаў пад сукно. Паміж паасобнымі групамі і студэнтамі спаборніцтва не разгорнута. Прагулы і спазьненьні вельмі частыя. Вось ганебны сьпіс „студэнтаў" выключаных з тэхнікуму за ненаведваньне лекцый: Кісялевіч, Бірыла, Лопкін і студэнты радыё-курсаў—Кунцэвіч, Цялешка і Яфімаў; сьпіс злосных прагульшчыкаў: Гінтаў, Гэльфанд, Іозьнова, Мікуловіч, Жыўлюк, Ліўшыц, Макавецк.

Пры складаньні ўмовы па спаборніцтву студэнты ўзялі на сябе абавязак організаваць у інтэрнаце бытавыя комуны. Комуны дагэтуль неорганізаваны. Чырвоны куток пры інтэрнаце на замку. Выпісаныя для кутка газэты прападаюць.

Кіраўніцтва комсамольскай ячэйкі ня здолела стаць на чале грамадзкай дзейнасьці тэхнікуму. Часта можна пачуць:—„А дзе-ж комсамольцы, што яны робяць"?! Ячэйка не займаецца пытаньнем ажыцьцяўленьня спаборніцтва і акадэмпасьпяховасьці.

Г. Фрыд

Загартаваныя ў клясавых бойках

Армейскі комсамол, узьнімаючы на новыя вышыні баявую падрыхтоўку, разгортваючы бесьперабойную дзейную сыстэму тактычнай і тэхнічнай трэніроўкі, падрыхтаваным сустрэне заклік партыі і ўраду—абараняць бацькаўшчыну сусьветнага пролетарыяту

Нататкі з армейскіх комсамольскіх конфэрэнцый

Пацяшайцеся, гаспада, але „шэры Грышка“ зламае вам галаву

„Газэта Польска“ дае ацэнку нашаму чырвонаармейцу.

Вельмі цікава пачуць, як пільсудчыкі ацэньваюць чырвонаармейца. „Газэта Польска“ ў артыкуле пад назвай „Савецкі салдат“ піша:

„Агульная думка аб каштоўнасьці савецкага салдата перад вайной была вельмі здавальняючая. Ваенныя спэцыялістыя яшчэ ў час сусьветнай вайны асабліва ў першыя яе гады, прытрымліваліся ідэалу салдата, прысвоенага яшчэ з часоў Фрыдрыха Вялікага. Вось чаму „Грышка“—барадаты расійскі гігант, легендарны пажыральнік тузіна караваеў хлеба, які дазваляе гнаць сябе на разьню без малейшага протэсту,—выклікаў вялікае зьдзіўленьне ня толькі ў сваіх саюзьнікаў французаў, але і ў прадстаўнікоў армій цэнтральных дзяржаў, выклікаў зайздрасьць, як пекны матар'ял для гарматнага мяса“.

Нам, бязумоўна, ня нова хлусьня пільсудчыкаў і яна нас ня зьдзіўляе. Пільсудчыкі, раўняючы чырвонаармейца з „барадатым расійскім гігантам Грышкай“, імкнуцца здалёк дыскрэдытаваць Чырвоную армію ў вачох працоўных Польшчы.

„Рэволюцыя загадала яму („Грышку“) для перамены зрабіцца таварышом, членам рабоча-салдацкага савету і чырвонаармейцам. „Грышка“ тады дазволіў сябе ўцягнуць у рэволюцыйны рух, як калісьці зрабіў гэта для сьвятасьці імпэрыі самадзяржаўнага цара“.

Гэта ня рэдкі прыклад тупога розуму нашых ворагаў. Але пойдзем далей. У будучай вайне, канчае „Газэта Польска“ свой артыкул, выйграе ня толькі той супраціўнік, які будзе ўладаць надзвычайна добрым узброеньнем, найноўшымі сродкамі барацьбы, танкамі, самалётамі, броневікамі, але той, салдат які зможа правільна гэтымі сродкамі опэраваць. Цяжка ўявіць сабе, каб СССР у бліжэйшы час змог узьняць разумовае разьвіцьцё, ідэйную каштоўнасьць, асабліва сваіх сялянскіх мас, так, каб яны маглі зраўняцца з салдатамі заходніх армій у ўладаньні складанымі задачамі, якія ставяцца сёньня шэраму салдату... Бедны „Грышка“ зноў прымушаны будзе разьлічвацца сваёю крывёю“.

Аб бедным „Грышку“ зразумела гаварыць тут залішне.

Чырвонаармеец, хай яго і клічуць Грышкай, Міхасём ці Майсеем—ня былы „бедны, шэры, загнаны салдат“. Пільсудчыкі пацяшаюць сябе самаабманам, паклёпніцкімі выдумкамі яны думаюць сябе супакоіць. Але хай толькі пасьмеюць польскія фашыстыя, якія служаць „культурным“ бар'ерам паміж „барбарствам“ бальшавікоў і „цывілізацыяй“ імпэрыялістых, і іншыя драпежнікі „вымусіць расплачвацца сваёю крывёю „Грышку“!

Па думцы польскіх фашыстых, чырвонаармеец—гэта той самы былы царскі шэры салдат. Чырвоная армія—ня армія імпэрыялістых, у якой імкнуцца прывучыць салдата наменей думаць, паболей працаваць, дзе выдзяюць яго над салдатам.

64,25 проц. салдат „высокакультурнай“ арміі Францыі, дзе вось ужо 50 год, як існуе закон абавязковага ўсеагульнага навучаньня, ня маюць пасьведчаньня аб скончанай хаця-б пачатковай школы (а пачатковая школа ва Францыі вельмі не патрабавальная).

Мы ня будзем, спраўляцца з Пільсудчыкамі аб тым, ці зьяўляецца чырвонаармеец старым шэрым рускім салдатам. Кожны на працягу ці можа ўпэўніцца ў тым, што думкі пільсудчыкаў—хлусьня чысьцейшай маркі.

Мяне, напрыклад, асабіста прышлося ўпэўніцца ў высокай палітычнай сьвядомасьці нашых чырвонаармейцаў.

На 5 дывізіённай конфэрэнцыі комсамолу N стралковай беларускай Чырвонаштандартнай дывізіі імя Фрунзэ было так: Выступіў адзін з малодшага камандзірскага складу т. Доктараў і прыводзячы асобныя факты дрэннай працы грамадзянскага комсамолу ў справе вывучэньня вайсковай справы, імкнуўся абвінаваціць увесь комсамол у тым, быццам ён ня можа, ня хоча і не здолее абараніць у выпадку нападу імпэрыялістых, соцыялістычнае будаўніцтва.

Радавы чырвонаармеец—комсамолец Ганчароў—правільна ацаніў гэта выступленьне і даў адпор, хаця Доктараў і зьяўляўся камандзірам.

Аб чым сьведчыць гэты факт? Аб „шэрым салдаце“, ці аб сьвядомым, адданым генэральнай лініі партыі чырвонаармейцу?

А блёк-ноты, якія запаўняліся лічбамі, прапановамі, нататкамі—аб „шэрым салдаце“, ці аб высокакасным, адукаваным байцу?

Дык ці варта спраўляцца і даводзіць фашыстым борзапісцам усю іх хлусьню? Ім самім гэта добра вядома, але яны павінны хлусіць, яны павінны ашукваць асноўныя масы сваёй краіны, павінны ашукваць і запужваць усіх тых, хто можа заразіцца бальшавізмам.

НІШКА ВЕРНЫ.

Комсамол арміі заўсёды на варце

Гэта ня проста конфэрэнцыя. Гэта зьлёт ударнікаў баявой вучобы, якія першыя змагаюцца за баявыя тэмпы вучобы, за генэральную лінію партыі.

Па дакладу тав. Палякова ўжо мала гаварыць аб вайсковай небясьпецы—гэта зразумела. Гавораць аб тым, што неабходна популярызаваць Чырвоную армію, як армію інтэрнацыянальную, што ў слабой ваенізацыі грамадзянскага комсамолу вінаваты мы.

Комсамольцы дывізіі адчуваюць адказнасьць за становішча работы ня толькі ў шэрагах Чырвонай арміі, але ў грамадзянскіх організацыях. Гэта сьведчыць аб б... політычнай сьвядомасьці радавіка-комсамольца.

Аўторытэт комсамолу значна падняўся сярод байцоў. Вось маленькі прыклад. За 1930 год у комсамол прынята звыш 300 байцоў, а ў Н-скім палку толькі за студзень месяц комсамолія вырасла на 15 проц.!

Палепшаецца і выхаваўчая работа. Прарыў, які быў у мінулым годзе, зараз ліквідаваны. Лік перарасткаў у комсамоле паменшыўся з 35 да 10 проц., але конфэрэнцыя лічыць і гэты процант вялікім. Наладжаная саюзная асьвета мае свае вынікі. Звыш 150 лепшых комсамольцаў перададзены ў партыю. Але самая вялікая работа, праробленая комсамолам,—баявая падрыхтоўка.

Тут комсамол дапамагае партыйнай організацыі камандзкага складу выканаць і перавыканаць пляны баявой вучобы. Комсамольцы цягнуць за сабою астатніх. Комсамол бярэ на буксір ужо ня толькі адстаючыя ячэйкі, а цэлыя падразьдзяленьні. У 3-й роце Н-скага палка прарыў. Комсамольцы палк. школы бяруць роту на буксір і ў сваёй пастанове пішуць. „Мы будзем дрэннымі комсамольцамі калі не даб'емся пералому“. Пералом ёсьць, рота выпраўлена.

У другім палку 35 комсамольцаў становяцца ўдарнікамі-варашылаўцамі і бяруць на сябе абавязак скончыць школу малодшых камандзіраў на два месяцы раней тэрміну. Для таго каб стаць клясным стралкамі камандаваньне дае месяц тэрміну, і задача выканана!

У сваім дакладзе нач. подзіў прыводзіць дзесяткі прыкладаў, калі комсамольцы перавыконваюць свае сустрэчныя пляны.

Зараз комсамол дывізіі перабудоўваецца на ячэйкі. Ён шукае новых форм і мэтодаў работы, бо пераход ад груп садзейнічаньня партыі да комсамольскіх ячэек ставіць вельмі вялікія і адказныя задачы перад комсамолам.

Пераход на ячэйкі гаворыць аб тым што комсамольская організацыя Чырвонай арміі вырасла і здолее справіцца з тымі задачамі, якія перад ёю стаяць. Толькі дзеля гэтага конфэрэнцыя і разьбірае гэта асноўнае на сёньняшні дзень для армейскага комсамолу пытаньне.

Дрэнны бок работы комсамолу—сувязь з комсамолам грамадзянскіх організацый. Армейскі комсамол ня ўсё яшчэ зрабіў. Армейскі комсамол яшчэ ня стаў сапраўдным памочнікам у ваенізацыі грамадзянскага комсамолу. Грамадзянскія організацыі таксама не наладзілі сувязі з ячэйкамі Чырвонай арміі. Гэта трэба выправіць, бо бяз гэтага пролетарскі ўплыў на Чырвоную армію і ваенізацыя грамадзянскага комсамолу будзе слабым месцам.

Адчыняючы конфэрэнцыю, нач. падзіву гаворыць: „Комсамол дывізіі вытрыманы, згуртаваны наўкол генэральнай лініі партыі, актыўна змагаецца за правядзеньне гэтай лініі ў жыцьцё“.

Дывізія мае комсамольскую організацыю, якая здолее выканаць асноўны лёзунг, пад якім праходзіць конфэрэнцыя; Н-скую Чырвонаштандартную Беларускую Дывісію у першыя ўдарныя рады РСЧА. комсамол бярэ на сябе гэты абавязак і справіцца з ім.

Пост „ЧЗ“—3.

За рашучы паварот „ЛК“ тварам да вытворчасьці

7-га лютага ўвечары, у Доме асьветы адчынілася першая агульнагарадзкая конфэрэнцыя „лёгкай кавалерыі“ г. Менску.

На конфэрэнцыю зьявілася каля 400 дэлегатаў „ЛК“. На вячэрнім паседжаньні дэлегаты заслухалі даклад сакратара Менскага гаркому ЛКСМБ тав. Янковіча аб выніках IX і X зьездаў комсамолу і даклад ГарКК КП(б)Б аб задачах „ЛК“.

У сваім дакладзе тав. Янковіч падкрэсьліў: „Мала зараз таго, што „ЛК“ зробіць налёт на сав. ўстанову і выявіць бюракрата; мала выявіць што ў кооперацыі гнілая каўбаса, гэта дробязь. Трэба, каб „ЛК“ змагалася за органічнае аздараўленьне нашага савецкага ці



профсаюзнага апарату. Трэба, каб „ЛК“ з сваіх радоў рыхтавала лепшых ударнікаў рабочых у савецкі апарат, вывучала-б прычыны—чаму гнілая каўбаса, ці па віне прадаўца, ці па віне кіраўніцтва кооперацыі, ці па віне ўсіх нас з нашым дрэнным, яшчэ не наладжаным рабочым кантролем.

Далей тав. Янковіч застанаўліваецца на тым, што трэба „ЛК“ рашуча выйсьці на перадавыя пазыцыі 3-га рашаючага году пяцігодкі узяцца па-баявому за праверку рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі яравых пасеваў на 1931 год і г. д. Рашуча павярнуцца да выкананьня прамфінпляну на фабрыках і заводах.

У канцы дакладу тав. Янковіч спыніўся на ваенізацыі комсамолу і рабочай, колгаснай і беспартыйнай моладзі. „У Менску ўбачыш на лыжах, на каньках, у ціры чырвонаармейца, а грамадзянскага комсамольца, які-б займаўся вайсковай падрыхтоўкай праз спорт і днём з агнём ня ўбачыш. Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым што мы зусім дрэнна выконваем задачы падрыхтоўкі да абароны Кастрычнікавых заваёў. Трэба памятаваць, што клясавы вораг, жывучы разам з намі, вучыцца страляць, але ён будзе страляць, зразумела, не па тых, хто пасігне на нас, а па нас з вамі. Таму мы павінны ўжыць лёзунг: „няма месца ў КСМ тым, хто ня хоча вучыцца абараняць заваёвы Кастрычніка“.

Ж. Ю.

Час. вык. абав. адк. рэдактара С. АНІС...

Ільлічоў

Вынікі IX зьезду УсеЛКСМ і задачы армейскага комсамолу

IX зьезд УсеЛКСМ і X зьезд ЛКСМБ маюць вялікае гістарычнае значэньне ў жыцьці і разьвіцьці комсамолу ўсяго Саюзу, у тым ліку і комсамолу Чырвонай арміі.

К свайму зьезду ленінскі комсамол прышоў адзінай, ідэйна згуртаванай вакол генэральнай лініі партыі організацыяй, на справе апраўдаўшы сваю ролю сапраўднага памочніка партыі.

Не патрэбны нам гэроі голых фраз

Зьезд з усёй рашучасьцю падкрэсьліў: „Мы разьбілі правых, трэба з імі змагацца і далей, трэба быць пільнымі, але трэба барацьбу з правым опортунізмам перанесьці ў штодзённае жыцьцё, у штодзённую практыку“ (Кагановіч—дакл. на IX зьезьдзе).

Гэтая пастаноўка цалкам адносіцца і да армейскага комсамолу. Гэта значыць, што палітыка месьціцца ня толькі ў тым, каб яе абараць у рэзолюцыі, але менавіта ў тым, каб яе перанесьці ў штодзённую практычную работу, павесьці рашучую барацьбу з няўменьнем працаваць, з няўменьнем організоўваць масы вакол конкрэтных задач. Нярэдка бывае, што выносіцца надзвычайная добрая па сутнасьці правільная рэзолюцыя, але на практыцы выходзіць, што ня ўсё правільна, яшчэ многа буйнейшых практычных недахопаў. Слаба праводзіцца барацьба з конкрэтнымі носьбітамі зла. Зараз нам патрэбны не гэроі голых фраз, а гэроі тэмпаў работы, барацьбы за соцыялізм, за якасьць. Трэба памятаць, што „у сучасных умовах, пры сучасным характары клясавай барацьбы той, хто дае лепшую якасьць работы і самыя высокія тэмпы, той літаральна цкуе буржуазію, заганяе капіталізм у дамавіну, не дае яму дыхаць, выжывае капіталізм са сьвету. Хто дае лепшую якасьць і самыя высокія тэмпы работы, той зьяўляецца самым кваліфікаваным, самым перадавым магільшчыкам варожае нам клясы, г. зн. магільшчыкам капіталістычнае клясы“ (Косараў.—Справаздача на IX зьезьдзе).

„Вайна можа выбухнуць кожную хвіліну“

Ва ўмовах работы армейскага комсамолу гэты год зьяўляецца годам рэконструкцыі Чырвонай арміі, годам павышаных патрабаваньняў баявой і політычнай падрыхтоўкі, годам тэхнічнага ўзбраеньня. Барацьба за тэмпы, за якасьць, за высокую... за поўнае авалоданьне тэхнікай, за бальшавіцкія адносіны да зброі—асноўная задача армейскага комсамолу.

Комсамол Чырвонай арміі к свайму зьезду прышоў адзінай, згуртаванай організацыяй, з радам посьпехаў у сваёй практычнай рабоце. „У асноўным зрабіў паварот у баявой падрыхтоўцы“. Але гэта ня ўсё. І ўся бяда ў тым, што зараз застыгнуць на дасягнутым ўзроўні, гэта значыць ня выканаць задач, пастаўленых РВС Саюзу. Адсюль асноўная задача—у самы найкарацейшы тэрмін закончыць поўны паварот тварам да баявой падрыхтоўкі і ауладаньня тэхнікай. Гэтая ўстаноўка павінна быць стрыжнёвай за ўсёй рабоце армейскага комсамолу. Гэтаму нас абавязваюць рашэньні зьезду, гэтаму нас абавязваюць тыя міжнародныя абставіны, у якіх мы з вамі жывем.

У той час, як Савецкі Саюз пасьпяхова выконвае пяцігодку, шпарка нясецца к соцыялізму, а капіталістычны сьвет перажывае глыбокі руйнуючы экономічны крызіс, у гэты час спробы капіталістых усіх краін накіраваны на тое, каб гэты крызіс вырашыць за кошт Савецкага Саюзу. Яны шалёна падрыхтоўваюць вайну, выдумляюць усякія плёткі, каб мобілізаваць грамадзкую думку супроць першай у сьвеце дзяржавы Саветаў. Тав. Варашылаў у сваёй прамове на IX зьезьдзе, калі гаварыў аб нашых задачах, асабліва падкрэсьліў, што нам трэба павышаць якасьць нашай работы, нашай продукцыі, іменна зараз, бо „вайна можа выбухнуць кожную хвіліну“. Гэтага нельга забываць, аб гэтым трэба памятаць у правядзеньні ўсёй нашай практычнай работы.

(Працяг будзе)

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599